# Голас Радзімы

№ 31 (2069)
4 жніўня 1988 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.




Старажытны Віцебск адкрыў новую старонку ў летапісе дружалюбных сувязей дзвюх братніх краін — Савецкага Саюза і Польшчы. Быццам дзве магутныя рукі паднялі ў цэнтры горада над Дзвіной збягаючыя ярусныя лесвіцы цэнтральную канцэртную пляцоўку новага эстраднага комплексу, дзе праходзілі канцэрты першага Усесаюзнага фестывалю польскай песні (ніжні здымак).

Разбегліся па вуліцах і плошчах абласнога цэнтра стракатыя рэкламныя тумбы, шматлікія гандлёвыя латкі з маляўнічай фестывальнай эмблемай.

Члены журы фестывалю (здымак справа) кампазітары Анатоль КРОЛ, Ігар ЛУЧАНОК і Януш СЛАВІНЬСКІ. (Працяг расказу пра Усесаюзны фестываль польскай песні ў СССР змешчаны на 7-й стар.).





З АФІЦЫЙНЫХ ПАВЕДАМЛЕННЯЎ

## СУСТРЭЧА Ў ЦК КПБ

Пытанням далейшага развіцця беларускай нацыянальнай культуры, мовы і літаратуры, народнай адукацыі, будаўніцтва і архітэктуры, удасканалення дзейнасці мясцовых савецкіх і партыйных органаў, адпаведных міністэрстваў і ведамстваў, сродкаў масавай інфармацыі ў гэтых напрамках была прысвечана сустрэча з групай творчай інтэлігенцыі рэспублікі, якая адбылася ў ЦК Кампартыі Беларусі.

Перад прысутнымі выступілі першы сакратар ЦК КПБ Я. Сакалоў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Г. Таразевіч. Яны расказалі аб прымаемых у рэспубліцы мерах па расшырэнню сферы актыўнага прымянення нацыянальнай мовы ў розных галінах дзяржаўнага, грамадскага і культурнага жыцця, аб далейшым развіцці міжнацыянальных сувязей Беларусі з іншымі рэспублікамі. Падкрэслівалася непрымальнасць якога-небудзь процістаўлення дэмакратычным прынцыпам свабоднага выбару мовы навучання, дзеянняў, якія раз'ядноўваюць нацыі і народнасці. Многанацыянальная сацыялістычная культура, адзначалі прамоўцы, павінна і надалей заставацца магутным фактарам кансалідацыі нашага грамадства.

У адкрытай, зацікаўленай размове прынялі ўдзел літаратары М. Дубянецкі, В. Сёмуха, Д. Бічэль-Загнетава, мастакі А. Марачкін, Р. Сітніца, У. Басалыга, журналісты, выкладчыкі.

Я. Сакалоў і Г. Таразевіч адказалі на шматлікія пытанні ўдзельнікаў сустрэчы. Было падкрэслена, што праблемы, якія абмяркоўваліся, стануць прадметам уважлівага разгляду ў ЦК Кампартыі Беларусі і ўрадзе рэспублікі.

УРАЧЫСТАСЦІ

## З ВЫПАДКУ ГАДАВІНЫ

Расце ўклад Беларусі ў развіццё ўсебаковых савецка-кубінскіх адносін, падкрэслівалі ўдзельнікі ўрачыстага сходу прадстаўнікоў працоўных горада, які адбыўся ў Мінску. Ён быў прысвечаны рэвалюцыйнаму святу Рэспублікі Куба — Дню нацыянальнага паўстання — 35-й гадавіне штурму казармы Манкада.

З дакладам выступіла намеснік старшыні праўлення Беларускага аддзялення Таварыства савецка-кубінскай дружбы, сакратар Белсаўпрофа С. Собалева.

Поспехі Кубы ва ўсіх сферах жыцця дасягнуты ў многім дзякуючы дружбе і супрацоўніцтву з Савецкім Саюзам, адзначыла, выступіўшы на сходзе, Эльса Пас, прадстаўнік зямляцтва кубінскіх аспірантаў, якія вучацца ў Мінску.

Удзельнікі ўрачыстага сходу накіравалі прывітальнае пісьмо ў адрас Асацыяцыі кубіна-савецкай дружбы і яе філіяла ў правінцыі Камагуэй.

У рабоце схода прынялі ўдзел намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР У. Мікуліч, намеснік Старшыні Савета Міністраў рэспублікі В. Крыцкі.

Прысутнічалі таксама консул генеральнага консульства ПНР у Мінску Х. Каліноўскі, консул генеральнага консульства ГДР у Мінску Х. Трынкс.

ВІЗІТЫ

## ГОСЦІ З КНДР

У Мінску знаходзілася дэлегацыя Таварыства карэйска-савецкай дружбы на чале са старшынёй цэнтральнага праўлення таварыства, членам ЦК Працоўнай партыі Карэі, міністрам сувязі Кім Ен Чхэ. Яна прыбыла ў нашу краіну па запрашэнню Саюза савецкіх таварыстваў дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі. Госці наведалі рэспубліканскую міжгароднюю тэлефонную станцыю, дзе прынялі ўдзел у мітынгу, прысвечаным месячніку салідарнасці з барацьбой карэйскага народа за вывад замежных войск з Паўднёвай Карэі і аб'яднанне краіны на мірнай дэмакратычнай аснове.

Члены дэлегацыі сустрэліся з кіраўніцтвам і актывістамі Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі.

У час двухдзённага візіту госці пабывалі на мемарыяльным комплексе «Хатынь», дзе ўсклалі кветкі да Вечнага агню, на Кургане Славы. Яны пазнаёміліся з экспазіцыямі Дома-музея І з'езда РСДРП, Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі, зрабілі экскурсію па гораду.

ПРАМЫЯ СУВЯЗІ

## УМАЦОЎВАЕ ДРУЖБУ ЭВМ

Замігцелі экраны дысплеяў у праўленні калгаса імя Варанецкага Бераставіцкага раёна. Электроніка, якая пачала разлікі аптымальных рацыёнаў і севазваротаў, замяніла адразу дзесятак спецыялістаў.

Паяўленне ЭВМ у калгасе — вынік прамых сувязей з польскім сельгаскааператывам «Бялута», які знаходзіцца недалёка ад Варшавы. Ва ўмовах гаспадарчага разліку, калі калгасу нявыгадна стала трымаць у сябе лішкі тэхнікі, іх абмянялі на дэфіцытную пакуль што ў рэспубліцы электроніку. З яе дапамогай можна аператыўна, кампетэнтна «ўмешвацца» ў вытворчасць.

Пачатак садружнасці польскага кааператыва і беларускага калгаса паклаў калектыўны падрад, на які перайшлі жывёлаводы калгаса імя Варанецкага. Дабіцца важнага канчатковага выніку можна было толькі маючы паўнацэнныя кармы. Тэхналогіі вырошчвання высокабялковых рапсу, гароху і кармавога бобу таксама дапамаглі ўкараніць польскія суседзі.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ВЕНСКІЯ КРЭСЛЫ З... БЕЛАРУСІ

Магчыма, калегі з Аўстрыі па-добраму пазайздросцяць мазырскім майстрам-дрэваапрацоўшчыкам. Таму што менавіта з імі заключыла кантракт на продаж у еўрапейскіх краінах венскіх крэслаў вядомая фірма «Содзім», якая гандлюе мэбляй. Першая партыя прадукцыі вытворчага аб'яднання «Мазырдрэў» ужо адпраўлена ў Бельгію.

Вядома, аўстрыйскі бук у Беларусі не расце. І тым не менш яго з поспехам замяняюць айчынная вольха, асіна і бяроза. Уся справа ў найноўшай суперсучаснай тэхналогіі вырабу крэслаў, распрацаванай і прымененай мазыранамі. Абсталяванне, створанае на вытворчасці, дазваляе выпрацоўваць гнута-клееныя венскія крэслы ў стылі «рэтра» з... адходаў. Яны амаль нічым не адрозніваюцца ад сваіх старадаўніх сабратоў, і цана на іх, натуральна, больш даступная.

На рэспубліканскім гандлёвым кірмашы, які завяршыўся нядаўна ў Мінску, высокі клас беларускіх майстроў прыцягнуў увагу да іх вырабаў і прадстаўнікоў іншых краін Еўропы. У Мазыры ўжо рыхтуюць да адпраўкі мэблю ў Англію, ФРГ і Францыю. А дзве заходнегерманскія фірмы нават паспяшаліся размясціць у аб'яднанні свае заказы на выраб мэблі па сваіх праектах.

Дарэчы, нягледзячы на выдатны попыт на венска-мазырскія крэслы за мяжой, не забыты і інтарэсы ўнутранага рынку. Ён таксама атрымаў больш за сто тысяч цудоўных вырабаў.

СПРАВЫ КАЛГАСНЫЯ



**У неспрыяльных сёлетніх умовах, калі пад вадой Прыпяці, якая разлілася ў час дажджоў, засталася вялікая частка сенакосаў, сяляне процідаставілі стыхіі арганізаванасць, уменне, кемлівасць. У калгасе «Расія» Лунінецкага раёна ў гэтыя дні працавалі і стары, і малы. Таму калгасны статак не застанецца без кармоў, будзе расці вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі. А ад яе колькасці напрамую залежыць аплата працы калгаснікаў.**

**НА ЗДЫМКУ: з раніцы да вечара на калгасных лугах ідзе касавіца.**

ДЛЯ АКЦЫЙ МІЛАСЭРНАСЦІ

## ПРЫНЯТА РАШЭННЕ

Трыста тысяч рублёў будзе выдзелена сёлета на дапамогу інвалідам Вялікай Айчыннай вайны і воінам-інтэрнацыяналістам. Такое рашэнне прынята на сумесным пасяджэнні бюро праўлення Беларускага аддзялення Савецкага фонду міру, прадстаўнікоў Таварыства Чырвонага Крыжа БССР і рэспубліканскага савета ветэранаў вайны і працы. Гэтыя грошы пойдуць на аплату паслуг патранажных сясцёр. Яшчэ 200 тысяч рублёў з бюджэту Фонду міру вырашана расходаваць на распрацоўку і ўкараненне спецыяльных прыстасаванняў для інвалідаў у грамадскім транспарце.

Матэрыяльная дапамога інвалідам — гэта толькі частка вялікай праграмы Беларускага аддзялення Савецкага фонду міру, якая прадугледжвае фінансаванне і шэрагу іншых акцый. У іх ліку — удзел у збудаванні мемарыяльнага комплексу «Буйніцкае поле» пад Магілёвам, правядзенне Дзён Беларусі ў Эфіопіі, арганізацыя сумесна з таварыствам «Радзіма» аркестраў народных інструментаў для суайчыннікаў у Аргенціне.

НОВЫЯ ВЫРАБЫ

## У ДАРОГУ — З «ПРОМНЕМ»

«Прамень» будзе дапамагаць вадзіцелям у далёкай дарозе. Мінскім гадзіннікавым заводам у адрас аўтамабільных заводаў, якія выпускаюць «Жыгулі», «Таўрыю», «Волгу», аўтобусы, адпраўлены асабліва дакладныя кварцавыя хранометры.

Спецыялісты-гадзіншчыкі, дасягнуўшы высокага тэхнічнага ўзроўню вырабаў, імкнуцца давесці кожную мадэль да дасканаласці. Напрыклад, на базе міні-будзільнікаў, якія добра зарэкамендавалі сябе (іх у свой час завод асвоіў першым у краіне), цяпер выпускаюцца новыя прыборы: па жаданню іх уладальніка яны могуць разбудзіць і гукавым зумерам, і любой з трох запраграміраваных мелодый.

КУЛЬТУРА

## АБ'ЯДНАЛА «СПАДЧЫНА»

Культурна-грамадскае аб'яднанне «Спадчына» створана ў Пружанах. Яго члены паставілі на мэце праз разнастайныя формы грамадска-культурнай і асветніцкай дзейнасці ўнесці свой уклад у справу патрыятычнага выхавання жыхароў раёна, расшырыць веды пра родны край, прапагандаваць духоўную спадчыну народа: фальклор, музыку, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, рамёствы.

У планах аб'яднання — стварэнне краязнаўчага музея, збор сродкаў і ўстанаўленне памятных знакаў на месцах гістарычных падзей, помнікаў і мемарыяльных дошак славутым землякам. У рабоце аб'яднання могуць прыняць удзел усе жадаючыя.

РАСПРАЦОЎКІ

## КАМП'ЮТЭР — ПАДАРОЖНІК

Галоўны інжынер мінскага завода «Электроніка» адкрыў «дыпламат», і адтуль пачуўся голас. Гэта быў не магнітафон, а камп'ютэр, невялікая часопіснага фармату скрыначка. Некалькі мінут камп'ютэр расказваў аб сваіх здольнасцях — уменні абыходзіцца з лічбавым і тэкставым матэрыялам, ілюстраваў гэта складанымі формуламі і графікамі, радкамі вершаў на экране, які займае трэць плошчы, а к канцу выканаў «Інвенцыю» Баха.

Гаспадар «дыпламата» Валерый Цароў растлумачыў, што гэта працуе рэкламная праграма. Сам прыбор ні ў чым не ўступае стацыянарным персанальным камп'ютэрам. Як і тыя, ён можа наладжваць кантакт з вялікімі ЭВМ, выдаваць вынікі на друкуючыя ўстройствы і графаскладальнікі. Весці дыялог з такім памочнікам можна дзе хочаш.

САЦЫЯЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ

## ПА ПРАЕКТУ КАЛГАСНАГА АРХІТЭКТАРА

Вёска Аношкі — цэнтральная сядзіба калгаса «Новае жыццё» Нясвіжскага раёна нагадвае цяпер вялікую будоўлю. Узводзяцца дзіцячы сад з зімовым басейнам, Дом жывёлавода, амбулаторыя, рад іншых аб'ектаў. Калгасны архітэктар — ёсць у гаспадарцы і такая пасада — Дзмітрый Назараў распрацаваў праект забудовы Аношак. Цяпер у вёсцы жыве семсот чалавек, у перспектыве ж яе насельніцтва павялічыцца да дзвюх тысяч.

Што і дзе размяшчаць — вырашылі самі жыхары Аношак. На сход прыйшлі ўсе сяляне: кожнага цікавіла, якой будзе яго родная вёска праз некалькі гадоў. Адобрыўшы праект у цэлым, яны выказалі рад прапаноў. Цэнтр калгаса будзе выглядаць як адзіны ансамбль. Непадалёку размесціцца зялёная зона адпачынку. Арганічна ўпішуцца ў аблічча вёскі сучасныя катэджы. Многія з іх будуюцца за грошы саміх навасельцаў — у калгасе дзейнічае першы ў Мінскай вобласці сельскі жыллёва-будаўнічы кааператыў.

ГЛЫБОЦКАЯ МАРКА

## НАРЫХТАВАЛІ Ў ЗАПАС

Прадукцыі, якую пачаў выпускаць Глыбоцкі кансервавы завод, рэклама не спатрэбіцца.

Тут пабудаваны сучасны цэх па вытворчасці зялёнага гарошку. Прадпрыемства ўжо адправіла ў гандлёвую сетку вялікую партыю гэтых кансерваў.

Цяпер адразу з поля прадукцыя трапляе на канвеер. У раёне загадзя паклапаціліся аб яго бесперабойнай рабоце: сёлетняй вясной многія калгасы і саўгасы значна расшырылі пасяўныя плошчы каштоўнай вітаміннай культуры.

Устаноўленая ў цэху высокапрадукцыйная лінія дазваляе перапрацоўваць за змену звыш сарака тон гароху.

АДПАЧЫНАК



**У прыгожым месцы, на беразе Дняпра, размясцілася новая база адпачынку Рэчыцкай нафтаразведачнай экспедыцыі глыбокага бурэння. У гэтыя пагодныя дні тут праводзяць вольны час дзесяткі буравікоў.**

**НА ЗДЫМКУ: база адпачынку рэчыцкіх нафтавікоў.**





Узнаўленне рыбных запасаў Нарачанскага краю — галоўны клопат тутэйшага рыбакамбіната. Па-гаспадарску выкарыстоўваюць магчымасці водных прастораў рыбакі возера Свір. Сёлета ў яго будзе запушчана 170 тон сяголеткаў карпа, сазана, вугра.

НА ЗДЫМКАХ: падкормка рыбы на возеры; пяць год рыбачыць на Свіры Вікенцій КІРЫЧЭНКА.

Фота А. НІКАЛАЕВА.

### КАЛГАСНЫ ПАСТУХ МІКАЛАЙ СІЛКО ПІША ВЕРШЫ

# НЕ БЫЦЬ РАЎНАДУШНЫМ

У вёсках нярэдка даюць людзям мянушкі, якімі народ трапна характарызуе чалавека, свае адносіны да яго, да яго характару, вартасцей ці недахопаў.

Мікалая Сілко аднавяскоўцы з даўніх часоў завуць «сяржантам». Адразу і не разбярэш, чаму раптам так празвалі калгаснага пастуха. Смяюцца: камандзір над каровамі? Мусіць, ёсць у мянушцы частка і гэтага значэння. Але калі чуеш, як звяртаюцца да Мікалая Аляксандравіча людзі, як размаўляюць з ім, разумееш, што сапраўдны сэнс у іншым. Невысокае званне ў арміі сяржант, але для простага салдата няма большага аўтарытэту. Сяржант не прымае стратэгічных рашэнняў, ён разам з салдатамі іх выконвае. Знаходзіцца з імі ў аднолькавых умовах, а адказнасць нясе большую. Характар у Мікалая Аляксандравіча нераўнадушны, усе вясковыя справы яго цікавяць, а жыццёвы вопыт і абвостранае пачуццё справядлівасці дапамагаюць даць належную параду таму, хто ў гэтым мае патрэбу.

Мікалай Сілко вядомы ў акрузе і яшчэ па адной прычыне, якая, уласна, і прывяла мяне да яго. Вось ужо многа год ён піша вершы. Робіць гэта проста для сябе, але, калі просяць, ахвотна чытае іх аднавяскоўцам. Дарэчы, пазней я даведаўся, што ў вёсцы Вялікая Слабада Карэліцкага раёна на Гродзеншчыне, дзе жыве Мікалай Аляксандравіч, і ў суседніх вёсках свае сілы ў паэзіі спрабуюць многія. Магчыма, сама прырода гэтага прынёманскага краю закранае ў душы паэтычныя струны.

— Напэўна так,— сказаў мне Мікалай Аляксандравіч.— Вось выходжу на досвітку з дому, кругом такая прыгажосць, прастор, сонейка ўстае. І неяк самі сабой словы складваюцца ў вершы. Потым вазьму і запішу.

**Дзень стаў большым, і вышэй**
**Сонца паднялося.**
**Наваколле аж пад гай**
**Вадой залілося.**

**Пахне траўка сакавіта.**
**Распускаецца садок.**
**З вулля пчолкі працавіта**
**Паляцелі па мядок.**

**А паветра пах цудоўны,**
**Хоць ты шапкаю лаві.**
**Стаў ад песень гай наш поўны,**
**Славяць ранак салаўі.**

Паколькі я не спецыяліст, не бяруся судзіць аб паэзіі Мікалая Сілко. Можа не хапае яму прафесіяналізму, можа не заўсёды ўдаецца рыфма. Але характар аўтара раскрываецца.

Прагледзеўшы некалькі сшыткаў вершаў Мікалая Аляксандравіча, я зразумеў, што аб гэтым чалавеку трэба абавязкова расказаць. Мы многа гаворым аб славутасцях, аб вядомых паэтах і артыстах, аб дырэктарах аб'яднанняў і саўгасаў, аб вучоных і вынаходніках. Словам, аб людзях неардынарных. І часта забываем аб тых, хто называецца адным простым, але ёмкім словам народ. У вершах Мікалая Сілко адлюстравана не толькі прыгажосць роднай прыроды. Многія з іх прысвечаны нязначным у дзяржаўным маштабе, але важным для Вялікай Слабады падзеям. Ёсць і сатырычныя, пра мясцовыя недахопы. Інтарэсы Мікалая Аляксандравіча выходзяць і далёка за межы яго вёскі. Яго хвалявалі і рэвалюцыя на Кубе, і вайна ў В'етнаме, і палёты ў космас. Па яго вершах можна прасачыць і ўвесь яго ўласны лёс, які непарыўна звязаны з лёсам усяго нашага беларускага народа. У жніўні Мікалаю Сілко спаўняецца шэсцьдзесят год. Колькі перажыта за гэты час? Была панская Польшча. У цяжкія гады вайны сям'я засталася без бацькі — маці і чацвёра дзяцей. Але хапіла волі і сіл не толькі выжыць самім, але і дапамагаць партызанам, якія знаходзіліся ў навакольных лясах. Потым была служба ў арміі. Пасля яе паспытаў Мікалай Аляксандравіч гарадскога жыцця. Стаў працаваць на Мінскім трактарным заводзе. Здавалася б, усё наладзілася. Сям'я, добрая работа, жыллё. Але не давалі спакою думкі аб роднай вёсцы, снілася яна начамі, і днём успаміны адбіваліся сумам на душы. Многае перадумаў Мікалай Аляксандравіч і ўсё ж, пражыўшы пяць год у горадзе, вырашыў падацца зноў у Вялікую Слабаду. А было гэта якраз у тыя гады, калі людзі, наадварот, стараліся выехаць з вёскі ў горад. Але яму патрэбна была вёска.

**Здаецца, ў нас і дождж**
**цяплейшы,**
**І сонца ласкавей пячэ,**
**Здаецца, тут і дзень**
**святлейшы,**
**Рака чысцейшая цячэ.**

К таму часу ў Мікалая Аляксандравіча было ўжо чацвёра дзяцей. Давялося пачынаць жыццё фактычна спачатку. Як ён сам гаворыць, каб пабудаваць дом — улезці па вушы ў даўгі. Каб разлічыцца і карміць сям'ю, трэба было працаваць ад цёмнага да цёмнага. Так ён працуе і па сённяшні дзень, хоць нібыта і няма ўжо неабходнасці. Усе дзеці сталі на ногі, жывуць сваімі сем'ямі, падрастаюць сямёра ўнукаў. Але кожную раніцу Мікалай Аляксандравіч сустракае не дома. У любое надвор'е выганяе ён калгасны статак на пашу. У ім дзвесце галоў. А колькі працы патрабуе ўласная гаспадарка. Цяпер Мікалай Аляксандравіч з жонкай трымаюць дзвюх кароў і бычка, ёсць свінкі, куры, свой агарод, цяпліца, вуллі. Жывуць заможна. Але ён ніколі не імкнуўся толькі да ўласнага дабрабыту. Тут яго родная зямля, родны калгас, і ўсе пытанні, звязаныя з развіццём гаспадаркі, хвалююць Мікалая Аляксандравіча. Ён многа думае аб тым, як зрабіць лепшым жыццё ў роднай вёсцы, і не сароміецца выказаць свае думкі начальству. Нездарма ж прыкіпела да яго мянушка «сяржант».

Узяць хаця б такі выпадак. Якраз перад нашым знаёмствам у Мікалая Сілко здарыўся канфлікт са старшынёй і некаторымі членамі праўлення калгаса. Тры гады назад напярэдадні 40-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне Мікалай Аляксандравіч па ўласнай ініцыятыве і без староннняй дапамогі пасадзіў уздоўж дарогі каля шасцідзесяці дрэў — па колькасці жыхароў Вялікай Слабады, якія не вярнуліся з вайны. Так з'явілася ў вёсцы алея Памяці. Але адзін механізатар чамусьці з'ехаў на трактары ў кювет і зламаў пару дрэў, потым другі. Вядома, гэта абурыла Мікалая Аляксандравіча, ды і іншых жыхароў вёскі. (Цяпер ужо многія даглядаюць тую алею). Вось і адправіўся ён у праўленне. А там пачалі тлумачыць, што дарога вузкая, яе трэба расшыраць, а ў памяць загінуўшых будзе ўстаноўлены помнік.

— Такі помнік варта было б устанавіць даўно,— гаворыць Мікалай Аляксандравіч.— Я разумею, што ў праўлення шмат іншых клопатаў, да ўсяго рукі не даходзяць, і сродкі патрэбны немалыя. Таму невядома, калі ён з'явіцца. А алея ўжо ёсць, дрэвы растуць, і ўсе ведаюць, у памяць каго яны пасаджаны.

— Што ж вы збіраецеся рабіць?

— Восенню пасаджу новыя дрэвы на месцы зламаных,— цвёрда адказаў Мікалай Аляксандравіч.— Ну а калі будуць расшыраць дарогу, то мы іх перасадзім. Людзі дапамогуць, у нас мала раўнадушных. Мы гаспадары на сваёй зямлі, і ад кожнага з нас залежыць, якой яна будзе. На жаль, у некаторых гэта пачуццё гаспадара страцілася, і да жыцця яны ставяцца як спажыўцы. Але так жыць нельга. Я асабіста так не магу.

**Рыгор ФАМЕНКА.**

### БЛАКІТНЫЯ ДАРОГІ ВІЦЕБШЧЫНЫ

# НА ДЗВІНЕ НАВІГАЦЫЯ

У адну з нядзель я адправіўся ў рачны порт «Віцебск». Быў па-сапраўднаму сонечны і цёплы майскі дзень. Унізе каціла задумлівыя воды Заходняя Дзвіна. Ад прычала павінен быў адысці ўніз па цячэнню маленькі цеплаход з пасажырамі на борце. Без доўгіх разважанняў я таксама купіў білет і падняўся на судна.

Цеплаход узяў курс да вёскі Сінякова. Гэта канчатковы пункт прызначэння, калі кіравацца ад абласнога цэнтра. Адлегласць у адзін бок 53 кіламетры.

З борта цеплахода навакольны свет успрымаецца больш маляўніча і абвострана. Цёплы вецер і свежае паветра напаўняюць грудзі. Вочы разбягаюцца, калі бачыш шчодрую паводку і не менш магутны разліў зеляніны па берагах. Як жа збядняем і абкрадваем мы сябе ў гарадской мітусні, усё далей адступаючы ад чароўнага свету прыроды!

Аднак усё гэта лірыка — і не больш, падумалася мне. А экіпаж судна працуе, нясе звычайную вахту. Летась, помніцца, я вось гэтак жа захацеў «праветрыцца» па Дзвіне. За штурвалам цеплахода тады стаяў капітан Уладзімір Краснабаеў, рачнік з зайздросным стажам работы ў Віцебскім порце — два дзесяткі год. Вучнем у яго быў матарыст-рулявы Леанід Ляпёшкін.

За год адбыліся пэўныя змены. Капітан Краснабаеў перайшоў на грузавы буксірны цеплаход. А яго малады вучань вырас да другога памочніка капітана. А Леаніду ж яшчэ толькі 22 гады.

Мы разгаварыліся. Леанід Ляпёшкін скончыў Ламаносаўскае мараходнае вучылішча. Пры жаданні мог бы плаваць па марах і акіянах.

— Пацягнула на радзіму — на Віцебшчыну, — прызнаецца ён. — Ды і на малой вадзе спраў хапае...

Вось так прышвартаваўся малады марак да родных берагоў. І не шкадуе. Прыгажосць вакол якая! Да таго ж і пры важнай справе. Узяць хаця б гэты сённяшні рэйс. Ён далёка не для адпачынку. Як правіла, усе пасажыры цеплахода — сельскія жыхары. Водным шляхам дабіраюцца яны ў родныя мясціны. З абласнога цэнтра едуць многія гараджане (таксама былыя сяльчане), каб у выхадныя дні дапамагчы бацькам, папрацаваць на зямлі. А не заўсёды ж лёгка і проста бывае дабрацца да месца прызначэння аўтамабільным ці чыгуначным транспартам. Вось тут і выручае маленькі цеплаход з баржай. Да таго ж падарожжа па рацэ прыемнае і карыснае: свежае паветра, нетаропкія гутаркі з землякамі.

Цеплаход курсіруе праз населеныя пункты Каньшы, Навасёлкі, Дарагакупава, Лукі, Дзягілева, Старое Сяло, Цербешава, Полцева, Івеніна, Вяжышча, Улазавічы з канчатковым спыненнем у Сінякове. Затым назад уверх па Заходняй Дзвіне. Праўда, хуткасць у судна ў параўнанні з аўтамабільнай проста смешная: уніз па рэчцы да пятнаццаці кіламетраў у гадзіну, а назад і таго менш — усяго восем-дзевяць. Разам з тым для адпачынку на свежым паветры, для ўстанаўлення душэўнай раўнавагі ёсць у такім падарожжы свае неаспрэчныя перавагі: не ўсім і не заўсёды даспадобы ўзрастаючыя хуткасці дваццатага стагоддзя.

Калі ўлічыць, што ў віцебскім порце 21 судна, то і капітанаў столькі ж. Дарэчы, на адным з буксірных цеплаходаў працуе сямейны экіпаж А. Марозава. Побач з бацькам два яго сыны — механік Пётр і рулявы Іван.

Воды Заходняй Дзвіны празрэзваюць такія вось маленькія цеплаходы, буксіры, плытавозы. Віцебскі рачны порт абслугоўвае лінію працягласцю тры з паловай сотні кіламетраў — ад горада Веліжа ў Смаленскай вобласці да Верхнядзвінска ў Віцебскай. Далей Заходняя Дзвіна становіцца намнога паўнаводней і паступова накіроўваецца ў басейн Балтыйскага мора.

На «сваёй» тэрыторыі маленькі рачны флот нясе звонку непрыкметную, але вельмі важную для людзей вахту. Рачны транспарт і самы танны. Ён практычна не патрабуе сродкаў на ўтрыманне дарогі. Калі чыгуначныя і аўтамабільныя дарогі трэба пастаянна расшыраць і рамантаваць, то водныя створаны самой прыродай. Патрабуецца толькі эфектыўна іх выкарыстоўваць.

Сотні тысяч тон народнагаспадарчых грузаў перамяшчаецца па вадзе. У іх ліку прамысловая драўніна, будаўнічыя матэрыялы. З рэчышча Заходняй Дзвіны здабываюцца пясчана - гравійныя сумесі. Значная частка заказаў — ад сельскай гаспадаркі. Толькі для эксперыментальнай базы імя Шмырова Віцебскага раёна летась для ўнутрыгаспадарчага будаўніцтва і дарог дастаўлена па рацэ каля трох тысяч тон пяску і гравію. Ды і іншыя калгасы, саўгасы, дарожна - будаўнічыя арганізацыі пастаянна карыстаюцца паслугамі віцебскага рачнога флоту.

Са студзеня бягучага года калектыў порта перайшоў на поўны гаспадарчы разлік і самафінансаванне. Гэта з'яўляецца асновай яшчэ больш паспяховай работы. У юбілейны для рэспублікі год віцебскія рачнікі павінны перавезці 1 мільён 850 тысяч тон народнагаспадарчых грузаў.

Вясенне - летняя навігацыя праходзіць паспяхова. Заходняя Дзвіна — рака мелкаводная і камяністая, з цяжкімі ўмовамі суднаходства. За ёю, як гаворыцца, пастаянны нагляд патрэбен. Малая рака патрабуе вялікай увагі.

Многа цікавага даведаўся я з гутаркі з рачнікамі ў падарожжы па Заходняй Дзвіне. Мы гаварылі і пра праблемы абнаўлення рачнога флоту, пра тое, што неабходны сучасныя, больш хуткаходныя і лёгкія пасажырскія судны. Пра дэфіцыт добрых суднавадзіцеляў. Пра цяжкі лёс Заходняй Дзвіны, якая ўсё больш мялее і забруджваецца...

Я сышоў на бераг з борта цеплахода каля невялікай вёсачкі Лукі. А судна паплыло далей уніз па рацэ...

**Віталь ФЕДАРАЎ.**

## ИЗДАНИЯ «ГОЛАСУ РАДЗІМЫ»




Вторая мировая война, несомненно, была самым трагическим событием в истории многих народов планеты. Поэтому понятен тот огромный интерес, который проявляют к ней до сих пор люди, в особенности историки. Разгром фашистской Германии и ее сателлитов был достигнут благодаря общим усилиям государств и народов антигитлеровской коалиции. Это хорошо знают и ценят народы нашей страны. Вместе с тем истина такова, что судьба мира, настоящее и будущее человечества решались на полях сражений Великой Отечественной войны, что решительный вклад в разгром фашизма внес именно СССР.

Вопреки этой очевидной истине в большинстве работ буржуазных историков, в особенности в Англии и США, эти факты отрицаются и фальсифицируются. Критическому анализу реакционной западной историографии, ее взглядов на вторую мировую войну, разоблачению фальсификаторов, которые стремятся приписать решающую роль в разгроме фашизма США и Великобритании, была посвящена брошюра А. Семеновой «Правда о Великой Победе», изданная редакцией в год 40-летия Победы советского народа в Великой Отечественной войне.

Эта брошюра вызвала чрезвычайно большой интерес у читателей. Мы получили много писем из разных стран с высокой оценкой работы А. Семеновой. Читатели в США, Канаде, Великобритании писали также, что им самим эта брошюра окажет большую помощь в спорах с людьми, подпавшими под влияние буржуазной пропаганды в этих странах, но было бы хорошо издать ее и на английском языке, чтобы прочесть ее смогли не только соотечественники.

Мы выполнили эту просьбу. Брошюра А. Семеновой «Правда о Великой Победе» переведена на английский язык, издана в «Библиотечке «Голасу Радзімы» и скоро поступит к нашим постоянным читателям.

**Г. ФОМИН.**

## ПО СЛЕДАМ СОБЫТИЙ

# МОСКОВСКАЯ ТАМОЖНЯ

# ПРОТИВ КОКАИНОВОЙ МАФИИ

Недавно в Москве с грузом кокаина задержано несколько иностранцев, следовавших транзитными рейсами Аэрофлота в страны Западной Европы. Московская таможня раскрыла новый, ранее не применявшийся канал транспортировки смертоносного товара. С просьбой прокомментировать это событие корреспондент АПН обратился к заместителю начальника Управления по борьбе с контрабандой Главного управления государственного таможенного контроля при Совете Министров СССР Юрию Федоскину.

— Мы впервые столкнулись с этим видом наркотиков, хотя прежде уже имели дело с героином, гашишем, марихуаной,— отметил Ю. Федоскин. — Однако появление кокаина у пассажиров, следующих через Москву в Западную Европу, не стало неожиданностью для нас. Более того, наши службы заранее провели большую аналитическую работу и даже спрогнозировали возможность этого.

— На чем основывался этот прогноз?

— Во-первых, в какой-то момент стало очевидно, что кокаиновый рынок в США перенасыщен наркотиком, а значит, мафия будет искать новые рынки сбыта. Ими стали западноевропейские страны, где до поры до времени кокаин был не столь популярен.

Во-вторых, контрабандисты не случайно решили использовать для «отмывки» маршрутов рейсы именно через Москву. Главную роль тут сыграло не столько удобство сообщения, сколько наша высокая репутация. Во всем мире хорошо известно: ввоза и вывоза наркотиков непосредственно из СССР практически не существует. Таким образом, контрабандист, прибывающий в западноевропейский аэропорт из Москвы, не привлекает к себе особого внимания таможенников — они ведь не всегда знают, что наша столица была лишь пересадочным пунктом.

Профессиональное мастерство наших таможенников, имеющиеся в их распоряжении средства — от сверхчувствительной техники до специально обученных животных, которые, кстати, будут применяться все более широко, — служат надежной преградой для кокаиновой мафии. Как работают наши службы, знают специалисты многих стран. Представители Великобритании, например, изучавшие наш опыт, присутствовали как раз при задержании партии гашиша. В сотрудничестве с канадскими таможенниками мы изъяли крупную партию наркотиков в грузовом контейнере, лишив тем самым монреальских наркоманов их годового «пайка». Кстати, в том, что мы надежно перекрыли этот канал переброски наркотиков через территорию СССР, коренится еще одна причина, по которой международная наркомафия ищет иные пути транспортировки своего товара. Всего же на московской таможне с конца 1986 года было задержано приблизительно 11 тонн разнообразных наркотических веществ.

Такая «урожайность» свидетельствует не только о повышении результативности нашей работы, но и об активизации контрабандистов. Сейчас на них работает целая индустрия камуфляжа, транспортировщики применяют самые хитроумные полостные сокрытия. Мы ко всему этому готовы, стараемся глубже анализировать ситуацию, разрабатываем контрмеры.

**Илья ПРОЦЕНКО.**

**В июле 1975 года на орбиту для совместного полета и стыковки поднялись корабли «Союз» и «Аполлон». Полет стал возможным благодаря разрядке, взаимному стремлению СССР и США к расширению научно-технического сотрудничества. Идея объединения усилий государств в мирном освоении космоса актуальна и сегодня. Об этом беседуют научный обозреватель АПН Михаил ЧЕРНЫШОВ и участник полета «Союз» — «Аполлон» летчик-космонавт СССР дважды Герой Советского Союза Валерий КУБАСОВ.**

## КОСМИЧЕСКИЕ ИССЛЕДОВАНИЯ: ПРОЕКТ «СОЮЗ» — «АПОЛЛОН»

# ТРИДЦАТЬ ЛЕТ СПУСТЯ...

*— Если брать техническую сторону, то главная цель полета заключалась в том, чтобы испытать на орбите совместимые средства стыковки космических кораблей, провести ряд научных экспериментов. Но в общем-то все понимали, что речь идет и о другом: проверке способности двух ведущих космических держав сообща решать крупные научно-технические задачи, получая при этом взаимную выгоду. Полет «Союз» — «Аполлон», писали газеты тринадцать лет назад, навсегда останется символом того, как государства с различным общественным строем могут объединенными усилиями решать глобальные проблемы. Насколько оправдались эти прогнозы?*

— Проект «Союз»—«Аполлон» по сей день остается крупнейшей акцией в истории советско-американского космического сотрудничества. После полета были годы, когда уровень кооперации в совместных работах достигал почти нулевой отметки, и все же проект не вычеркнут из памяти людей, о нем помнят и сегодня. Недавно я вернулся из США. Там проходила первая международная конференция юных астронавтов. Были делегации из многих стран, включая и СССР. Конференция проходила в Оклахома-сити, на родине Томаса Стаффорда, одного из пяти непосредственных участников полета. Открывать конференцию довелось Стаффорду и мне, позже к нам присоединились еще двое участников полета — астронавты Дональд Слейтон и Вэнс Бранд. К сожалению, на встречу не смог прилететь Алексей Леонов. Во встречах с юными астронавтами все участники полета «Союз»—«Аполлон» желали молодежи работы только на мирный космос.

*— Наверное, небезынтересно узнать, как сложились судьбы тех, кто в июле 1975 года оказался на самой верхушке «космической пирамиды»?*

— Что ж, время идет. И судьбы, естественно, складываются по-разному. Дональд Слейтон и Томас Стаффорд сейчас на пенсии, но продолжают работать, занимаются частным бизнесом. Слейтон возглавляет фирму, производящую ракеты для запуска спутников дистанционного зондирования природных ресурсов. Томас Стаффорд входит в состав правления компании, производящей оборудование для добычи нефти. Эта компания, кстати, имеет связи с советскими внешнеторговыми организациями. Томас Стаффорд постоянно поддерживает и деловые, и дружеские контакты с советскими людьми. Вэнс Бранд остается пока действующим астронавтом. После проекта «Союз»—«Аполлон» он еще дважды слетал в космос, надеется на новую встречу с орбитой.

Что касается советских участников полета, то Алексей Леонов уже много лет занимается проблемами обеспечения космических полетов, он заместитель начальника Центра подготовки космонавтов. А я ведаю в основном некоторыми техническими вопросами, связанными с созданием космических кораблей и орбитальных станций, в частности системами жизнеобеспечения.

*— В состоянии советско-американской космической кооперации в последнее время заметен определенный прогресс. В минувшем году, например, подписано соглашение о возобновлении сотрудничества в области исследования планет с помощью автоматических станций. Сложнее дело обстоит с пилотируемыми полетами. Здесь, похоже, советская и американская стороны сошлись на том, что все вопросы совместных пилотируемых полетов требуют дополнительного рассмотрения. В каких направлениях, на ваш взгляд, могло бы развиваться сотрудничество?*

— Таких направлений несколько. Первое — это совместные полеты в околоземном пространстве. Скажем, на станции «Мир» можно было бы осуществить длительную экспедицию. Американский «Шаттл» подходит к станции, стыкуется с ней. Несколько американских астронавтов переходят на «Мир» и вместе с советскими космонавтами выполняют насыщенную самыми актуальными экспериментами исследовательскую программу. Она может включать как практические вещи, скажем, по новым материалам и биотехнологии, так и фундаментальные исследования, например, по астрофизике.

Наиболее крупной акцией в дальнем космосе был бы, конечно, совместный пилотируемый полет на Марс. Нынешний уровень науки и техники позволяет реализовать такой проект. Правда, это дело дорогостоящее, но именно поэтому и надо объединяться. И не только Советскому Союзу и США. Почему бы к проекту не подключиться, скажем, Японии, европейским государствам?

Я уверен, что такой проект рано или поздно будет осуществлен. И еще одно. В качестве подготовки к нему нужны полеты автоматических станций. Нынешний проект «Фобос» как раз необходимое звено в этой исследовательской цепи, в дальнейшем будут нужны и другие рейсы автоматов. Их назначение — выбрать место посадки для пилотируемого корабля, хорошо изучить этот район. И все же независимо от полетов автоматических станций надо начинать проработку и пилотируемой экспедиции. Здесь много вопросов. Мы, например, до сих пор не определили, нужна ли будет искусственная тяжесть (центрифуга) для марсианского корабля или нет? Ключевыми пунктами остаются вопросы посадки модуля на Марс, старта его с планеты, возвращение корабля на Землю. Скорость встречи возвращающегося с Марса корабля с земной атмосферой будет намного превосходить все то, с чем мы имели дело до сих пор, отсюда большие проблемы с нагревом корпуса аппарата. И все же хочу подчеркнуть: все проблемы в принципе поддаются решению.

Взять ту же систему жизнеобеспечения. Ясно, что она должна иметь замкнутый круговорот веществ, если не на сто процентов, то по крайней мере на девяносто восемь. Недавно в нашей печати были опубликованы некоторые возможные проекты марсианских кораблей массой в несколько сот тонн. Если на таком корабле стартует экипаж одной страны, то достаточно было бы 5—6 человек, в международном экипаже состав участников можно расширить. Но принципы построения и корабля, и тех же систем жизнеобеспечения в данном случае не меняются. В целом подготовка пилотируемого полета займет лет пятнадцать, начинать ее, как уже говорилось, желательно сейчас.

*— И все же марсианский проект в лучшем случае — дело начала следующего столетия. А если опуститься на землю и посмотреть на более близкие земные проблемы? Нельзя ли здесь найти какие-то обнадеживающие перспективы для сотрудничества? Известный резонанс, например, получило сообщение о заключении американской фирмой «Пейлоуд системз» с Главкосмосом СССР контракта на проведение биотехнологических экспериментов на борту станции «Мир»...*

— Уверен, что биотехнологии принадлежит большое будущее. Появятся небольшие заводы — на спутниках и орбитальных станциях — по производству лекарств и белковых препаратов. Но до этого этапа еще надо дойти, пока же требуется продолжать и фундаментальные исследования, и отрабатывать эксплуатационные технологические установки. «Пейлоуд системз» обратилась к нам потому, что ей для исследований в невесомости требуется длительный срок — несколько месяцев. «Шаттлы» летают обычно лишь по неделе, максимум месяц. В данном случае мы имеем пример чисто коммерческого соглашения: советская сторона обеспечивает транспортные задачи, все тонкости технологии остаются секретом американской фирмы.

Безусловно, подобные формы сотрудничества можно и должно развивать. Но было бы неправильным замыкаться лишь на них. Возможны и другие формы кооперации, например, обмен технологиями. В советско-болгарском полете на советской установке «Ручей» проводились исследования по противогриппозным средствам. Здесь некоторые эксперименты ставили специалисты Австралии. Они заявили, что намерены поделиться результатами работ со всеми участниками кооперации. Наверное, это как раз тот пример, когда от сотрудничества выигрывает вся мировая наука. Словом, можно приветствовать все формы кооперации — и коммерческие, и какие-то иные,— лишь бы все это работало на благо человека, во имя его процветания.

(АПН).

# CONTROLAR POR LA RAZON

## LA CONSTITUCION DEBE SER EFECTIVA

LAMENTABLE paradoja: la ley no es ley. ¿Desean ustedes ejemplos? Helos aqui: una circular emitida por un ministerio puede desmedular la decisiòn del máximo órgano legislativo; la milicia puede más que los tribunales; los tribunales no se guían por la ley escrita, sino por las órdenes de los jefes, transmitidas por teléfono.

¿Por qué ocurre así? ¿Acaso, no sabemos aplicar las leyes? ¿O estas leyes son imperfectas?

Este círculo de problemas lo abordaron en su charla, sostenida en la sede de "NM", el escritor Víctor ROZOV y Alexandr YAKOVLEV, doctor en ciencias jurídicas.

**A. Y.:** ¿De qué manera nuestra sociedad interpreta la jurisprudencia? Me parece que muchos creen que las leyes son una especie de recopilación de reglamentos muy complicados. Supuestamente, solo los profesionales las conocen. Es una actitud, yo diría, enajenante. Además, en la conciencia común, el derecho, como un fenómeno que gravita sobre nosotros y nos oprime, se coloca por encima del derecho, interpretado como instrumento que protege al individuo... Pero los diferentes aspectos del derecho se entrelazan a cada paso y a menudo esto ocurre sin que el individuo concreto se percate de ello. Ya por eso creo que hay que poner toda nuestra legislación bajo el control de las ideas inherentes a la sociedad — y comprensibles para ella,— en cuanto a lo que sepresentan la justicia y la moral.

**V. R.:** Citaré un caso real. Un adolescente de 14 años se fugó de un reformatorio. Quería ir a Moscú para asesinar a su propia madre. Suena horrible, ¿verdad? Pero he aquí los hechos. El padre del chico había muerto, y la madre vivía en concubinato con otro hombre. El hijo significaba un estorbo para la pareja. La madre, primero, lo echó a la calle y, luego, lo mandó al reformatorio. ¿Acaso esto no es espeluznante? El muchacho se sintió desesperado al aguardar alguna vindicación legal por la injusticia cometida contra él. ¿Y cómo puede saber que existe, o debe existir, la protección legal de sus intereses? Muy a menudo contemplamos los casos que nos hacen dudar de que la ley siempre es nuestro seguro instrumento de defensa.

O tomemos otro caso, del cual me ocupé durante largo tiempo. Un joven regresó a casa luego de cumplir servicio militar. Fue con unos amigos a un picnic en el bosque. Tomaron algunos tragos. Les faltó la bebida, y agredieron a unos pescadores que hacian sopa de pescado en una hoguera. Blandiendo un cuchillo sacapuntas, les reclamaron "compartir" el aguardiente. Hubo un forcejeo, y un niño sufrió leves quemaduras. Fueron tan leves, que ni siquiera fue necesario la asistencia médica. Pero el culpable de todo eso fue condenado a diez años de cárcel. Era un castigo evidentemente desmesurado en relación con la culpa. ¿Por qué? Pues, simplemente, porque los pescadores resultaron ser choferes del garaje que atiende a "altos jefes". ¿Dónde está aquí el sentido común?

**A. Y.:** El problema primordial es la independencia del tribunal. Ahora está en preparación la reforma judicial. De ella se piensa mucho, y es un tema muy debatido. Hay sugerencias de que el cargo de juez se declare vitalicio. Porque hoy, el juez a veces razona del siguiente modo: si yo no complazco a las autoridades locales, ellas me hundirán en las próximas elecciones. Se debate el asunto de restituir el tribunal de los jurados. Los dos jueces legos, que tenemos actualmente, resuelven junto con el juez el problema de la culpabilidad del procesado y de la pena a aplicar. En ocasiones se dejan llevar por la autoridad del juez como jurista profesional, y se desentienden de la facultad que tienen de examinar el caso objetivamente desde las posiciones de sus experiencias prácticas individuales. En cambio, los jurados (como en su tiempo sucedía en la Rusia prerrevolucionaria), al concluir la vista de la causa, se encerraban en una habitación especial, donde, sin presencia del juez, a solas con su conciencia, decidían si el procesado era culpable o no. Solo resolvían ese problema, pero por cuenta propia, y nadie podía presionarlos.

Importa también que la ley no sea demasiado "flexible", para que no se apliquen penas diferentes por delitos iguales. De otro modo, nunca acabaremos con la arbitrariedad.

**V. R.:** Desde luego, el problema de aplicar una pena justa tiene suma importancia. Pero hoy me interesa mucho más otra cosa: ¿por qué en nuestro país se cometen tantos delitos? A mi modo de ver, todo comenzó ya desde los tiempos del "comunismo de guerra". Más tarde — bajo Stalin — la sociedad se vio en un estado de esclavitud. Bajo Brézhnev, al parecer, nos sumimos en el feudalismo. Entonces, yo incluso soñe: ajalá que llegue aún en mi vida la época del absolutismo ilustrado. La vida misma nos habituaba a no cifrar muchas esperanzas en las leyes, nos habituaba a considerar que "las leyes no se escriben para todos". En la época de Stalin, cualquiera sabía que de un momento a otro podía convertirse en un preso, como millones de sus conciudadanos, y ser privado de casi todos los derechos. Bajo el gobierno de Brézhnev, por el contrario, todo el mundo estaba enterado de que en realidad existían castas privilegiadas, no sujetas a la ley, que vivían por encima de la ley.

**A. Y.:** Veamos qué evidencian las estadísticas de la delincuencia. Hay más transgresiones de la ley allí donde es más intensa la "migración de los cuadros", donde hay grandes obras en construcción, donde no existe una normal estructura demográfica con familias de tres generaciones. En tales estructuras, las generaciones mayores son guardianes de la moral. Los ancianos son respetados, y los adultos procuran evitar las transgresiones morales, por vergüenza ante los hijos. Pero en las obras en construcción solo se concentra la población activa, o sea, ni muy viejos ni muy jóvenes. Sus padres están lejos, todavía no tienen hijos, o están con los abuelos en otra parte. Nadie te reprochará nada de lo que hagas, ni tienes que dar cuentas a nadie. Y, como es sabido, no se dedicó mucha atención a la tarea de hacer la vida más cómoda, de organizar debidamente las horas de ocio de la gente.

En cuanto a la delicuencia económica, a mi modo de ver, sucedió algo monstruoso: obligamos a pasar a la clandestinidad a las formas legítimas de una efectiva actividad económica, basada en las relaciones monetario-mercantiles. Y para poder dedicarse e ella, hay quienes sobornan a los funcionarios estatales y, luego, sacan ganancias millonarias.

Las cooperativas actuales podrían desplazar fuertemente a la "economía sumergida", y disminuir o, incluso, eliminar la esfera donde las leyes no surten su efecto. Pero, con este fin, hace falta estimular a las cooperativas, en vez de cortarlas de raíz sin siquiera esperar que alcancen una sólida posicion financiera. Solo nos falta, también en las cooperativas, forjar la "economía sumergida".

**V. R.:** Nuestra historia reciente no es otra cosa que la lucha del Estado contra el individuo, contra la esencia humana. A cada paso oimosó "No pienses así y asá, no mires esto, no digas aquello". El largo y penoso menosprecio hacia los intelectuales, su esmerada y sistemática asfixia, llevaron a la degradación de la sociedad. Un Estado obrero y campesino. Suena perfecto. Pero, ¿gdónde están los intelectuales? ¿Dónde está el cerebro? El Estado no puede funcionar sin gente pensante, porque cometerá tonterías y llevará a sus habitantes a la perdición. Gorbachov hace bien cuando eleva, promueve a los intelectuales: la fuerza motriz de la sociedad es el ingenio, el talento, la inspiración el intelecto.

**A. Y.:** En relación con ello, me parece importante la idea muy frecuente hoy día: la moral se vio adulterada, enajenada de la sociedad. Lo mismo le pasó al derecho, aunque por su naturaleza el derecho no es una expresión de la voluntad del Estado, sino de la sociedad, no importa que sea a través del Estado.

De ahí nuestra situación actual, en que un analfabeto inspector de instrucción pública es como el Maestro Ciruela, que no sabe leer y puso una escuela, o un funcionario, que no sabe ni el abecé de la economía, decide los destinos de las empresas. Cada uno alega "tener derecho". Pero, si el derecho se rebaja para servir de criado al Estado, ya no uede ser un derecho genuino, o sea, un derecho para mí, para el individuo.

**V. R.:** En general, ¿cómo devolverle a todo el mundo el aspecto humano? Antes de que ello suceda, no se reducirá la delincuencia. ¿Se puede hablar del aspecto humano de quienes están atemorizados? Hasta ahora nuestro pueblo no se ha liberado totalmente del miedo. Tememos por la estabilidad de nuestra sociedad, tenemos miedo a la reforma monetaria, a un castigo injusto por parte de los superiores, tememos por nuestra propia palabra. Hace poco, un conocido mío me preguntó: ¿Leyó usted ayer el artículo de Nuikin? Me quedé boquiabierto: incluso hoy lo dice en voz baja. ¿Myu gracioso, no?

**A. Y.:** Yo confío mucho en la democratización. Cuando cada cual obtenga la posibilidad de influir en los destinos de la nación y tome conciencia de esta posibilidad, se desvanecerán paulatinamente los sentimientos de incertidumbre y desamparo.

Lo más importante es que nuestra Constitución debe ser un documento efectivo, y no meramente una recopilación de declaraciones buenas. Hacen falta leyes que revelen las cláusulas de ella. Pero no sirven aquellas que también se conviertEn en meras declaraciones, solo que más extensas. Hacen falta leyes que creen un mecanismo efectivo para hacer funcionar la Constitución.

**V. R.:** Efectivamente, el derecho hay que tratarlo en serio. Y que tal actitud nos ayude a tratar con menos seriedad la vida cotidiana de cada uno de nosotros. Siempre estamos preocupados. De ahí que haya tan pocas tertulias de amigos, poca alegría del contacto humano, poca alegría de la vida. Pero es que la vida va y, a pesar de todo, tiene muchas cosas positivas. Y que el derecho — no el de hoy, sino el que está en proceso — nos ayude a vivir no solo correctamente, sino también con alegría.

*Anotó*
**Andréi ROMANOV**

## *EN LA TIERRA NATAL*







*En la frontera occidental de nuestro país está ubicada Kobrin, una de las más antigüas ciudades de Bielorrusia. Durante largos siglos esta ciudad fue pertenencia de los príncipes rusos, lituanos y polacos; estuvo también sumida a las ordas tártaras.*

*La historia de Kobrin está relacionada con el nombre del gran capitán Alejandro Suvorov, al cual Catalina II obsequió la ciudad y en la que vivió él algún tiempo. En 1801 el distrito de Kobrin fue incluido en la recién formada gobernación de Grodno y formó parte de ella hasta 1921.*

*En el transcurso de más de cuarenta años contando desde el principio de nuestro siglo la ciudad sufrió grandes desvastes. Sus tierras fueron pisoteadas por las huestes del Kaiser, por las legiones de Pilsudski y por los invasores hitlerianos. Y con la expulsión de las hordas fascistas Kobrin logró al fin la paz tan largamente anhelada. Poco a poco fueron regresando a sus casas combatientes y guerrilleros; llegaron especialistas en economía con el fin de ayudar a la rápida reconstrucción de la derruida ciudad; de las repúblicas hermanas se recibieron materiales de construcción y maquinaria.*

*En 1945 fue reconstruido el canal Dnieper-Bug. Más tarde se construyeron la fábrica de conservas, la de reparaciones, la fábrica de herramientas, la de confección, la tejeduría.*

*Hoy Kobrin es una ciudad moderna muy confortable. Su adecuada ubicación en el cruce de las carreteras principales, su cercanía de Brest y el vedado de Bielovezh atraen a miles de turistas tanto soviéticos, como extranjeros. Y la ciudad los acoge cordialmente.*

*En las fotos:*
*1. Busto de A. Suvorov instalado ante el museo de historia militar. En esta casa vivió el general.*
*2. Obelisco en memoria de las formaciones militares que liberaron la ciudad de Kobrin durante la Gran Guerra Patria.*
*3. En el estrado del parque actúan artistas aficionados de la Fábrica de confección de Kobrin.*

*Texto y fotos E. KOBIAK.*

**Redactor de la «Página en español» D. OKULIK.**

*НАТХНЯЛІ РОДНЫЯ ВОБРАЗЫ*

# АКАДЭМІК ЖЫВАПІСУ З ВЁСКІ УБОРКІ

*ДА 160-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. ГАРАЎСКАГА*

СЯРОД скарбаў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі ў Маскве захоўваецца сціплы пейзаж, на якім намалявана ўскраіна беларускай вёскі. Праз невялічкую ручаінку, што струменіць уздоўж драўлянага плота, перакінуты масток. Віецца ўдалячынь пясчаная дарога. На гарызонце відаць саламяныя стрэхі ўбогіх сялянскіх хатак. Вакол цішыня і запусценне... Вячэрнія цені ляжаць на звеях пяску.

І гэтая закінутасць, гэты холад бязмежжа, гэтая нязнанасць шляху балюча ўваходзяць у чалавечае сэрца.

Такі пейзаж не мог напісаць выпадковы сузіральнік. Бачна, што аўтар добра ведаў і любіў гэтыя мясціны, што ён правёў сярод прыроды ўсё сваё жыццё.

Жывапісцам, пэндзлю якога належыць пейзаж «На радзіме», а гаворка тут пра яго, быў акадэмік Апалінарый Гараўскі. Нарадзіўся ён у вёсцы Уборкі былога Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер Асіповіцкі раён Магілёўскай вобласці) у збяднелай дваранскай сям'і. Лясы. Сціплыя фальваркі. Свіслач, перагароджаная шматлікімі прыватнымі грэблямі—млынавымі і дзеля рыбнай лоўлі. Пейзаж гэтай самай Свіслачы ён напіша ў 1868 годзе: пясчаныя крутаяры — стромы, далечы, зарослыя шызай лазою, шапкі астравоў — нібы з зялёнага аксаміту — на імклівай паверхні ракі. І рэшткі карычневых ад часу пераплотаў, паляў дубовых, убітых у плынь, каб скіроўваць «на гак» плыты.

Дзесяцігадовым хлапчуком Гараўскі быў залічаны ў Брэст-Літоўскі кадэцкі корпус. Тут адбылося першае знаёмства з выяўленчым мастацтвам. Выдатныя здольнасці юнака заўважыў вядомы мастак і архітэктар Н. Бенуа, які часта наведваў свайго брата — палкоўніка, начальніка Гараўскага па Брэст-Літоўскаму кадэцкаму корпусу. Бенуа даў юнаку пачатковыя веды аб выяўленчым мастацтве і дапамог паступіць у Пецярбургскую акадэмію мастацтваў.

Ужо з першых гадоў навучання А. Гараўскі праявіў выдатныя здольнасці ў пейзажным і партрэтным жывапісе. Напісаны ім на Міншчыне ў час летніх канікулаў пейзаж «Балота» (1852) прыцягнуў увагу акадэмічнага савета. За гэтую работу малады мастак быў «удостоен похвалы». А царскі наследнік набыў пейзаж з акадэмічнай выстаўкі для сваёй калекцыі карцін.

У 1853 годзе А. Гараўскі паспяхова экспанаваў на выстаўцы другую сваю работу — партрэт уніяцкага епіскапа Вайткевіча, напісаны таксама ў час знаходжання на радзіме. Паэт і мастацкі крытык Апалон Майкаў у сваім аглядзе мастацкай выстаўкі, надрукаваным у часопісе «Отечественные записки», назваў гэту работу Гараўскага «выдатнай» і адзначыў яе ў ліку лепшых прац, паказаных на выстаўцы.

Да пачатку наступнага года малады мастак ужо атрымаў такую колькасць залатых і сярэбраных медалёў, якая давала яму права прэтэндаваць на вялікі залаты медаль. Тэмай конкурснай праграмы для Гараўскага быў зацверджаны пейзаж «Від у Пскоўскай губерні» (Дзяржаўны рускі музей). Эцюды да гэтага пейзажа былі прадстаўлены мастаком акадэмічнаму савету яшчэ задоўга да аб'яўлення конкурсу.

Месца для работы ў Пскоўскай губерні Гараўскі выбраў не выпадкова. Сюды якраз перасяліўся яго апякун Бенуа, у якога малады жывапісец часта бываў. Суровая паўночная суседка Беларусі — Пскоўская зямля палюбілася мастаку за падабенства з радзімай. Тут біўся з крыжакамі Якаў Палачанін. Мастак пісаў з натхненнем. За «Від у Пскоўскай губерні» Гараўскаму быў прысуджаны вялікі залаты медаль і званне класнага мастака, што давала права на зарубежную камандзіроўку. Аднак ён не адразу паехаў за мяжу.

Да мая 1853 года мастак жыве ў сябе на радзіме, у вёсцы Уборкі Мінскай губерні. Піша эцюды беларускай прыроды, кампануе станковыя пейзажы, імкнецца ўдасканаліць сваё прафесійнае майстэрства. Лепшымі яго творамі гэтага перыяду з'яўляюцца «Бераг ракі Свіслач», «Ліпы», «У ваколіцах крэпасці Бабруйск» і іншыя.

Ён шукаў. Хацелася перадаць адметнасць кожнай мясціны, убачыць у кожным пейзажы сваё, непадобнае. І мастаку часта ўдавалася гэта. Звычайна лічылі, што адрозніваюцца адзін ад аднаго толькі чалавечыя твары. А пейзажы ў чымсьці падобныя, пад Рымам яны былі напісаны ці над плынямі Віліі. Гараўскі адным з першых спрабаваў перадаць розніцу між тлустым Бярэзінскім ветрабоем і сухім ветрабоем палескім. Для яго на поўны голас гаварыла кожная вярбовая лаўжына, кожная хатка бабра, кожны водбліск святла на верхавіне дзічкі. Ён быў першы асабісты партрэтыст для кожнай травіны і кожнай галіны. Яму не трэба было вывучаць іх. Уся родная зямля заўсёды была з ім і ў ім. Дастаткова было ўспомніць. І таму ён не дараваў сабе ніводнай, нават самай дробнай памылкі. І таму многія пейзажы ён перапісваў па некалькі разоў. Так, у адным з пісьмаў да П. Траццякова ў 1857 годзе Гараўскі паведамляў:

«...Зараз я раблю «Ліпы» Кузьмы Цярэнцьевіча (Салдаценкава. — **Л. Д.**). Пачынаючы з неба, усё перапісаў нанава. Таму што калі я ўбачыў воблакі ў натуры і параўнаў іх са сваёй карцінай, дык зусім расчараваўся. З прыкрасці ўсё пачаў пісаць нанава».

Упартая праца прыносіла плён. Многія пейзажы атрымалі высокую ацэнку спецыялістаў. Некаторыя з іх набыў для сваёй галерэі і П. Траццякоў.

Аднак былі і няўдачы. Асабліва тады, калі карціны пісаліся на заказ. Так, «Пейзаж з каровамі», які мастак даволі доўга пісаў па заказу Салдаценкава, атрымаўся слабым. Гараўскі востра перажываў няўдачу. Ён скардзіўся Траццякову: «Па працы і па затрачанаму часу гэты пейзаж мне больш за ўсіх каштаваў, але гэта для мяне навука на будучыню: ніколі больш не буду ператвараць эцюд у карціну... Лягчэй было напісаць новае палатно, чым прыклейваць кавалачкі з розных месцаў, не маючы нават для гэтага месца на палатне...»

Акрамя пейзажа, у гэты перыяд мастак шмат увагі ўдзяляў і партрэту. Былі напісаны партрэты мінскага архірэя Галубовіча, мітрапаліта Галавіна і інш. Аднак, нягледзячы на ўсе цяжкасці і нягоды, мастак знаходзіў час, каб пісаць партрэты людзей з народа, якім шчыра спачуваў.

У гэтыя гады з'явілася карціна «Яўрэй на маленні» (палатно атрымала на выстаўцы ў Пецярбургу высокую ацэнку крытыкі) і «Старая на маленні» (1857).

Цікавая гісторыя стварэння «Старой на маленні». Задумаў яе мастак яшчэ ў 1856 годзе. Хутка ўзнікла кампазіцыя, і жывапісец прыступіў да работы. Але справа рухалася вельмі марудна. Натуршчыца, старая і хворая беларуская сялянка, была вельмі слабая і не магла падоўгу пазіраваць. Часам работу даводзілася спыняць на няпэўны час. Нарэшце карціна была завершана. Мастак паведаміў П. Траццякову: «Старую», якая шчыра са слязьмі на вачах моліцца, закончыў. І, дзякуючы ўсявышняму, яна атрымалася лепшым маім творам з усіх, якія я толькі пісаў...».

І ўсё ж «Старая на маленні» не спадабалася Траццякову. Адзначаючы высокае майстэрства жывапісца ў перадачы дэталяў, ён у той жа час папракаў яго за дрэнную кампазіцыю. Між тым твор гэты па сіле тыпізацыі, па глыбіні сацыяльнай характарыстыкі, па адухоўленасці вобраза — адзін з лепшых у спадчыне жывапісца.

Вось яго змест. Жанчына ў малітоўным экстазе падняла ўгару вочы. Яе вусны шэпчуць словы малітвы. Рукі, якія на сваім вяку зведалі ўсякую работу, скрыжаваны на грудзях. Глыбокія маршчыны прарэзалі шчокі, у вачах — слёзы. І ва ўсёй постаці, ціхай і пакорлівай, адчуваецца пратэст супраць несправядлівасці. Менавіта такой бачыў мастак жанчыну, такой і паказаў яе ў сваёй карціне. Аб ёй пісалі ў газетах і часопісах Расіі і за рубяжом. За гэты твор А. Гараўскаму было прысвоена званне акадэміка.

...У 1858 годзе Гараўскі едзе за рубеж. Некаторы час ён жыве ў Жэневе і Дзюсельдорфе. Там наведвае майстэрні жывапісцаў Каламы і Ахенбаха. Але сустрэча з імі не прынесла маральнага задавальнення. Знаходзячыся ў Жэневе, Гараўскі пісаў: «...У майстэрні Каламы я цяпер не займаюся і толькі зрэдку заходжу туды паслухаць парады і заўвагі. Астыў я да яго крыху за тое, што ён больш хваліць, чым папракае. Бог ведае яго сістэму навучання, мне здаецца, ён вялікі палітык. Урэшце да гэтага мне няма справы. Калам Каламам, але прырода, па-мойму, — самы лепшы настаўнік».

...Відаць, Гараўскі не схільны быў слепа пераймаць «рэцэпты» зарубежных майстроў.

Расчараваўшыся ў гэтым «удасканаленні», ён едзе ў Рым, у горад, які, па ўяўленню маладога мастака, быў «сталіцай усіх мастакоў свету». Але і тут яго чакала расчараванне. Чароўная прырода Італіі, яе багатая культурная спадчына выклікалі імкненне да мастацкай творчасці, але жыццё «абшчыны мастакоў» далёка не задавальняла. Якраз у гэты перыяд Італію запаланілі мастакі з усіх канцоў свету. Яны стварылі разнастайныя аб'яднанні і групы, якія мелі свае творчыя праграмы і прынцыпы. Гэтыя групы варожа ставіліся адна да адной, што ніяк не спрыяла творчасці. І зноў, як у Жэневе і Дзюсельдорфе, Гараўскі адчуў сябе адзінокім. Праўда, ён многа працаваў з натуры. Але яго моцна прыгнятала туга па радзіме. Не дабыўшы да вызначанага тэрміну, у 1860 годзе Гараўскі вяртаецца дамоў. З гэтага часу, на працягу амаль усіх 70-х і 80-х гадоў, мастак жыве ў Мінскай губерні, зрэдку выязджаючы ў сталіцу ды ў Пскоўскую губерню да сваякоў жонкі.

Зімнія месяцы Гараўскі праводзіць у Пецярбургу, дзе выкладае жывапіс у Вышэйшай мастацкай школе пры Акадэміі мастацтваў.

Яшчэ ў 1860 годзе, неўзабаве пасля вяртання з-за рубяжа, Гараўскі стварае ў вёсцы Брадзец Мінскай губерні названы ўжо пейзаж «На радзіме». Тут знайшлі ўвасабленне думкі і пачуцці мастака, яго роздум аб лёсе сваёй радзімы. У гэтай карціне — усё блізкае і дарагое сэрцу мастака. Кожная дэталь напісана з вялікай цеплынёй і любоўю, і гэта любоў міжвольна перадаецца гледачу.

Поспехі, якіх дасягнуў Гараўскі ў пейзажным і партрэтным жывапісе, не маглі, аднак, задаволіць аўтара. Ён марыў аб стварэнні вялікіх палотнаў, у якіх хацеў адлюстраваць веліч і прыгажосць сваёй радзімы. Але мастаку ўвесь час здавалася, што для гэтага ў яго яшчэ не хапае майстэрства, што трэба ўдасканальвацца. «Абцяжараны работамі для набыцця кавалка хлеба», мастак быў пазбаўлены магчымасці ажыццявіць свае мары.

Жадаючы дабіцца, каб яму прадоўжылі пенсіянерства, перапыненае ў 1860 годзе, Гараўскі падаў у савет Акадэміі рапарт, у якім прасіў камандзіраваць яго за граніцу на тры гады. Але савет Акадэміі просьбу адхіліў. Тады мастак стаў дамагацца дазволу прадоўжыць пенсіянерства ў межах Расіі. Паміж ім і Акадэміяй пачалася доўгая перапіска. Нарэшце ў 1869 годзе дазвол быў атрыманы. Гараўскі з натхненнем зноў бярэцца за работу. Ён накіроўваецца на Украіну, а пасля ў найбольш глухія мясціны Беларусі. У выніку з'явілася серыя партрэтаў і пейзажаў, лепшымі з якіх сталі карціны, напісаныя ў ваколіцах Мінска.

У 1870 годзе мастак пачаў працаваць над сваёй вядомай карцінай «Балота» (да гэтай тэмы ён звяртаўся яшчэ ў студэнцкія гады). Каб сабраць матэрыялы, Гараўскі паехаў у найбольш забалочаныя месцы Мінскай губерні, дзе зрабіў шмат эцюдаў з натуры. Аднак раптоўная хвароба надоўга прыкавала мастака да ложка. Працуючы над натурным матэрыялам да новых палотнаў, ён прастудзіўся і вымушаны быў на некаторы час пакінуць заняткі жывапісам.

З пейзажаў, створаных у пачатку 1870-х гадоў, найбольш цікавым і тыповым з'яўляецца «Вечар у Мінскай губерні» (Дзяржаўны мастацкі музей БССР). У гэтай карціне Гараўскі імкнуўся спалучыць акадэмічную ўмоўнасць з асабістым пачуццёвым успрыманнем. Мастак напаўняе карціну непаўторнай прыгажосцю 'заміраючага на ноч жыцця, любуецца афарбаваным ва ўсе колеры вясёлкі вячэрнім небам. Праўда, у каларыце яшчэ шмат чарнаты. Гэты недахоп мастак адчуваў. Ён імкнуўся ад яго пазбавіцца. І толькі ў канцы жыцця, ужо ў 90-я гады, чарната ў жывапісе Гараўскага была пераможана. Наступіў разліў фарбаў, з'явілася ясная празрыстасць, чысціня.

Працуючы над пейзажам, мастак адначасова піша шмат партрэтаў (пераважна ў час свайго зімовага знаходжання ў Пецярбургу). Гэта партрэты рэктара Пецярбургскай акадэміі мастацтваў жывапісца Бруні, кампазітараў Даргамыжскага і Глінкі (напісаны па фатаграфічных здымках. Цяпер яны знаходзяцца ў Траццякоўскай галерэі). У гэтыя ж гады працягваецца работа і над жанравымі палотнамі. Гараўскі паўтарае сваю вядомую карціну «Старая на маленні» (1872), піша эцюды народных тыпаў. У 1888 годзе на акадэмічнай выстаўцы з'явіўся славуты «Партрэт селяніна».

Час шмат чаго мяняў.

Новыя павевы ўладарна ўрываліся ў рэчаіснасць. Чалавек, які пачынаў старэць, мастак, які многа бачыў, не мог не зразумець, што старое адыходзіць, што пасля імпрэсіяністаў ужо нельга пісаць так, як пісалі ў сярэдзіне стагоддзя. Яму відавочна цяжка ламаць сваю манеру і самога сябе, ранейшага, але ён набіраецца мужнасці.

Ад сухаватага, скрупулёзнага капіравання натуры ён перайшоў да больш шырокага, абагульненага пісьма. У адным са сваіх апошніх лістоў да Траццякова ён адзначыў: «...Напісаў 20 эцюдаў, біў пераважна не на дэталі, а на адпаведнасць моманту, сонечнага святла і каларыту». Гэтую асаблівасць творчасці пейзажыста ў 90-я гады заўважыла і мастацкая крытыка. Так, аб карцінах Гараўскага «Восень» і «Час жніва», паказаных на акадэмічнай выстаўцы 1890 года, «Пецярбургская газета» пісала: «...Ёсць многа твораў, на якія глядзіш з задавальненнем. Так, напрыклад, у «Восені» Гараўскага столькі праўды ў фарбах, што нават незаконачанасць пісьма і пласкаватасць у малюнку не могуць знізіць агульнага ўражання».

Апошнія гады Гараўскі правёў у сваім невялікім маёнтку Кірылавічы, размешчаным непадалёку ад станцыі Белая былой Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі (135 кіламетраў ад Ленінграда), дзе і памёр у 1900 годзе.

Да канца сваіх дзён мастак заставаўся прыхільнікам рэалізму.

Ён ніколі не траціў сувязі з роднай Беларуссю, цаніў яе культуру, звычаі і мову. У пісьмах да Траццякова і іншых Гараўскі вельмі часта ўжываў беларускія словы і выразы. У паўсядзённым жыцці, сярод сваіх сяброў і блізкіх ён заўсёды карыстаўся беларускай мовай. Матывы радзімы вечна гучалі ў ягоным сэрцы.

Вялікая заслуга Гараўскага і ў справе захавання нацыянальных мастацкіх каштоўнасцей. На працягу доўгіх год сябруючы з П. Траццяковым, Гараўскі дапамагаў рускаму калекцыянеру знаходзіць і набываць лепшыя творы мастацтва для яго галерэі, якія потым сталі здабыткам усяго народа. П. Траццякоў высока цаніў думку Гараўскага аб творах жывапісу і ніколі не цураўся яго парад. Напрыклад, па рэкамендацыі Гараўскага і пры яго непасрэдным удзеле Траццякоў набыў вядомы партрэт скульптара-мадэльера Ф. Талстога работы С. Заранкі (цяпер знаходзіцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР), а таксама некаторыя палотны Баравікоўскага, Саўрасава, Багалюбава і іншых мастакоў. Гэты чалавек, акрамя таго, быў знаўцам старажытнага жывапісу, даўняй іконы, скульптуры, вырабаў мастацкага рамяства.

Творчая спадчына А. Гараўскага вялікая і разнастайная. Многія творы мастака можна ўбачыць у Маскве, Ленінградзе, Калініне і іншых гарадах краіны. Дзяржаўны мастацкі музей БССР мае каля дзесяці палотнаў Гараўскага, напісаных пераважна ў 60—70-я гады XIX стагоддзя. Вядзецца далейшая работа па адшуканню і вывучэнню творчай спадчыны жывапісца. Бясспрэчна, што новыя знаходкі дадуць магчымасць стварыць больш поўны творчы партрэт гэтага выдатнага прадстаўніка беларускай культуры другой палавіны XIX стагоддзя.

**Леанід ДРОБАЎ,**
**доктар мастацтвазнаўства.**

ПЕРШЫ ЎСЕСАЮЗНЫ ФЕСТЫВАЛЬ ПОЛЬСКАЙ ПЕСНІ «ВІЦЕБСК-88»

# ШЛЯХ ДА СЭРЦА ДРУГА







У прыгожым старажытным Віцебску, які прыбраўся і нібы памаладзеў, сустракаючы дарагіх гасцей, прайшоў фестываль польскай песні ў нашай краіне, які стаў яркім праяўленнем дружбы, прыязнасці, духоўнай блізкасці двух братніх народаў — савецкага і польскага. Глыбока сімвалічна, што праходзіў ён менавіта на беларускай зямлі, у рэспубліцы, якая сваімі гістарычнымі каранямі непарыўна звязана з польскім народам, яго шматграннай культурай. Свята прадоўжыла слаўную традыцыю збліжэння двух народаў, дзвюх культур, стала новым імпульсам для яе развіцця.

Уласна кажучы, тут, у Беларусі, фестываль пачаўся ўжо даўно, яшчэ некалькі гадоў назад, калі ў Віцебску ўпершыню пачалі праводзіць абласныя святы польскай песні. Вядома, пры выбары месца правядзення вялікую ролю адыграла і тое, што Віцебск — даўні пабрацім Зялёнай Гуры, дзе праводзяцца традыцыйныя конкурсы савецкай песні.

— Сардэчныя сустрэчы палякаў і беларусаў у Віцебску, пакланенне агульным святыням, абмен адрасамі, пісьмамі і песнямі, проста поціскам рук ужо забяспечылі поспех фестывальнай фіесце, — лічыць адказны сакратар галоўнага праўлення Таварыства польска-савецкай дружбы Станіслаў Левандоўскі. — Гэта і ёсць практычная рэалізацыя дагавораў і пагадненняў, падпісаных на высокім узроўні, сведчанне таго, што нядаўні дыялог Міхаіла Гарбачова і Войцеха Ярузельскага працягваецца простымі людзьмі, набываючы сімвалічны сэнс і глыбіню.

Цяперашні фестываль пацвярджае гэтыя словы. З эстрады прагучала песня, спецыяльна напісаная да свята народным артыстам СССР, кампазітарам Ігарам Лучанком, названая «Віцебск — Зялёна-Гура». Пад адным дахам выставачных залаў «сышліся» творы польскіх і беларускіх мастакоў, майстроў плаката і фатаграфіі. А 150 выканаўцаў-канкурсантаў бралі ўрокі майстэрства ў сваіх славутых калег.

Да ўдзельнікаў і гасцей фестывалю з сардэчным прывітаннем звярнуўся Генеральны сакратар ЦК КПСС М. Гарбачоў, у якім адзначыў, у прыватнасці, што песня — адзін з самых папулярных, любімых жанраў. Яна дапамагае людзям лягчэй знаходзіць шлях да сэрца друга, зразумець і палюбіць яго.

Дзень 22 ліпеня прайшоў на фестывалі пад знакам нацыянальнага свята Народнай Польшчы. Польская дэлегацыя на чале з сакратаром ЦК ПАРП Анджэем Васілеўскім, загадчык аддзела культуры ЦК КПСС Ю. Воранаў, сакратар ЦК КПБ М. Дземянцей, іншыя афіцыяльныя асобы зрабілі паездку ў Магілёўскую вобласць, у пасёлак Леніна, дзе прыняла першы бой з фашыстамі ў гады другой сусветнай вайны польская дывізія імя Тадэвуша Касцюшкі. Да помніка савецкім і польскім воінам, якія загінулі ў бітве пад Леніна, былі ўскладзены кветкі.

«Зямля — наш агульны дом». Такім быў дэвіз канцэрта, які прайшоў у той дзень. Гэтыя словы як нельга лепш вызначаюць ідэйную накіраванасць свята. Яго ўдзельнікам і гасцям прыслаў прывітанне першы сакратар ЦК ПАРП, старшыня Дзяржаўнага савета ПНР Войцех Ярузельскі.

«Песня прысутнічае ў жыцці чалавека і цэлых народаў, скарачае адлегласць паміж імі, праходзіць скрозь усе граніцы, — гаворыцца ў прывітанні. — Яна неабходна кожнаму, узбагачае душу, дапамагае жыць і працаваць. Аб гэтым неабходна помніць асабліва сёння, у час творчых перамен, якія нашы народы прынялі на сябе як вялікую справу абнаўлення сацыялізму і перабудовы».

Свята «Віцебск-88» закончана. Галоўных узнагарод першага Усесаюзнага конкурсу польскай песні ўдастоены навучэнка Калінінградскага музычнага вучылішча Марына Захарава і метадыст Ізмайлаўскага парку культуры і адпачынку масквічка Джэма Халід.

Другое месца і званне лаўрэатаў заваявалі народны вакальна - інструментальны ансамбль «Арфей» Палаца культуры металургаў Паўладара і саліст вакальна-інструментальнага ансамбля з Гродна Валерый Скаражонак. Ён сказаў, што на фестывалі яго чакала вялікая неспадзяванка: аб'явілі, што яго запрасілі на фестываль у Сопат.

Сярод лаўрэатаў і дыпламантаў конкурсу рок-група «Дэльта» эксперыментальнага творчага аб'яднання ўпраўлення культуры Мінскага гарвыканкома, Іна Афанасьева, салістка вакальна - інструментальнага ансамбля «Спектр» Палаца культуры і тэхнікі Магілёўскага вытворчага аб'яднання «Хімвалакно», група «Дзвіна» Дома культуры віцебскага вытворчага аб'яднання «Даламіт».

— Нам было цяжка аддаць перавагу таму або іншаму выканаўцу, — сказаў старшыня журы, народны артыст СССР, Ігар Лучанок. — Бо кожны з іх, па сутнасці, паказаў дастаткова высокі мастацкі ўзровень, самабытнасць у інтэрпрэтацыі твораў — ад фальклору да самых сучасных плыней у рок-музыцы. Нельга забываць, што гэта ўсё-такі самадзейныя артысты. Але спявалі ўсе яны ў лепшым сэнсе гэтага слова прафесіянальна.

Конкурс завершаны, але свята працягваецца, працягваецца дружба з песняй. Лаўрэаты і госці фестывалю выступаюць з канцэртамі ў амфітэатры, Дамах і Палацах культуры Віцебска. Потым адправяцца ў Маскву, дзе іх чакае сустрэча са сталічным гледачом.

Музычнае свята наглядна засведчыла, што савецкі і польскі народы за апошні час сталі яшчэ бліжэй адзін да аднаго.

**НА ЗДЫМКАХ: пераможцы фестывалю Марына ЗАХАРАВА (злева) і Джэма ХАЛІД; саліст вакальна - інструментальнага ансамбля з Гродна Валерый СКАРАЖОНАК; рок-група «Дэльта».**

**Фота У. МЯЖЭВІЧА, А. ЦАРЛЮКЕВІЧА.**

# ПАДАННІ І ГІСТОРЫЯ

**(Працяг. Пачатак у № 30).**

Але ёсць і іншая версія, таксама народная, на наш погляд, больш праўдападобная.

За кіламетр ад тых жа віленскіх Шведаў знаходзяцца так званыя «шведскія могілкі»— з дзесятак насыпаных курганоў, якія мясцовае насельніцтва прымае за пахаванні шведскіх салдат. Што такое «шведскія», або, як іх яшчэ называюць на Беларусі, «французскія могілкі», добра вядома вучоным, дзякуючы раскопкам беларускіх археолагаў. Гэта сівыя курганы, здалёк нагадваюць купалы, якія маюць правільную форму. Яны захоўваюць адно ці два старажытныя пахаванні, якія датуюцца вельмі даўнімі часамі — IX—XII стагоддзямі. Старажытныя курганы, поўныя велічы і таямнічасці, заўсёды карыстаюцца ў народзе пашанай. У некаторых мясцовасцях курганы называюць яшчэ валатоўкамі, бо лічыцца, што ў іх пахаваны асілкі, волаты, абаронцы роднай зямлі. Гэтыя курганы, «шведскія могілкі», і далі назву вёсцы.

Калі ж аднолькавых геаграфічных назваў сустракаецца шмат (больш за 15), то якімінебудзь выпадковымі абставінамі іх паходжанне растлумачыць нельга.

Так, амаль па ўсёй Беларусі, за выключэннем паўднёва-ўсходняй часткі яе, раскіданы вёскі з назвамі Татарск, Татарка, Татары, Татарская. Адкуль жа татары на Беларусі? У цікавым выданні «Легенды і паданні» (Мн., Навука і тэхніка, 1983) запісана цудоўнае, амаль гістарычнае апавяданне. Вось што там гаворыцца:

«Літоўскі князь Вітаўт, не маючы іншых саюзнікаў, прапанаваў крымскім татарам выступіць супраць польскага караля. Потым літоўскі князь прасіў, каб татары засталіся для вайсковай службы. Князь шчодра плаціў наймітам. Татар жанілі з мясцовымі дзяўчатамі. Па меры заняпаду Вялікага княства Літоўскага татары пачалі займацца гандлем і саматужніцтвам — выраблялі скуры. Рэлігія адмяжоўвала іх ад мясцовых жыхароў, і трымаліся яны адасоблена. Але паступова асіміляваліся, страцілі сваю мову: набылі мясцовыя імёны».

Дадаць штосьці да гэтага народнага апавядання цяжка. Яно заснавана на рэальных падзеях, што адбываліся паміж 1395 і 1398 гадамі, калі літоўскія князі перасялілі ўзятых імі ў палон пад Азовам татар, а таксама каля 400 сямействаў крымскіх караімаў, таксама цюркскага паходжання. Калоніі татар і караімаў, якім давалася свабода веравызнання, існавалі доўгі час у Нямежы, у былых паветах — Лідскім, Ашмянскім, Навагрудскім, Брэсцкім. Менавіта ў гэтых мясцінах і існуюць беларускія вёскі — былыя татарскія калоніі.

Але не заўсёды народныя паданні з такой амаль гістарычнай дакладнасцю адлюстроўваюць сапраўдныя падзеі. Так бывае ў тых выпадках, калі падзеі звязаны з народамі ці плямёнамі, якія даўно не існуюць, і толькі навуковыя даследаванні выяўляюць іх былыя справы і занятакі.

У назве ўрочышча Ятвязь на Гродзеншчыне зафіксавана імя балтыйскага племені ятвягаў, звесткі аб якіх сустракаюцца ў пісьмовых помніках X—XVI стагоддзяў. Старажытныя ятвягі жылі ў свой час ад Віслы на захадзе да тэрыторый сучаснай Гродзенскай вобласці.

А вось як тлумачыцца назва ўрочышча ў мясцовай легендзе:

«Гадоў трыста ці болей таму назад на тым месцы была вёска, што звалася Ятвязь. За грахі жыхароў вёскі бог наслаў на іх пошасць — халеру, ад якой усе жыхары памерлі». Як бачым, у гэтым паданні ўсё ж ёсць рэальная падстава — дата падзеі («гадоў трыста ці болей таму назад») і знікненне карэнных жыхароў мясцовасці. Але тлумачэнне гэтых абставін ужо казачнае.

Яшчэ больш фантастычнасці і казачнасці ў такім вось паданні.

«Даўно-даўно жыхары вёскі злавілі ў лясочку ля балота нейкую цудоўную істоту. Была яна чымсьці падобная да птушкі і нечым — да чалавека. Жыхары абулі гэтае стварэнне ў лапці і вырашылі весці да пана, які жыў на адным з астраўкоў гэтага балота. Людзі павялі цуд па кладках. А кладкі стукаліся аб ваду, і пачаў над балотам: «Гоц-гоц-гоц». Ад гэтага часу, гаворыцца далей у паданні, вёска, што знаходзіцца ў Салігорскім раёне Мінскай вобласці, атрымала сваю назву Гоцк.

Што ж гэта за цудоўная істота, дзякуючы якой існуе цікавая і вельмі загадкавая назва? Калі працягваць казку, то фінал яе атрымаецца не вельмі рамантычным: палешукі, якія сустрэлі дзіўнае стварэнне, доўгі час не ведалі, што гэта птушка сава. Калі ж прыцягнуць для вырашэння праблемы навуковыя меркаванні, то гісторыя назвы Гоцк аказваецца больш праўдападобнай. У ёй ускосна адлюстравалася імя ваеннадружыннага аб'яднання лясных вандроўнікаў-готаў, якія ў першых стагоддзях новай эры зрабілі вайсковы рэйд з берагоў Віслы ў Верхняе Падняпроўе і Прычарнамор'е. У склад гоцкіх дружын уваходзілі многія плямёны, у тым ліку і славяне. На нейкі час готы затрымаліся на землях сучаснай Беларусі, якія яны праходзілі з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход, таму не выпадкова праз некалькі стагоддзяў балтыйскія народы, у прыватнасці літоўцы, называлі беларускае насельніцтва пагранічных з Літвой раёнаў гудамі (ад назвы готы). У Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях ёсць некалькі вёсак з назвамі Гуды, Гудава, Гудагай, Гудзевічы і інш. Менавіта ад літоўскага **гуды** — «беларусы» і паходзіць іх назва. Мясцовыя ж паданні зыходзяць зусім з іншых абставін.

**(Заканчэнне будзе).**

